метадычных канцэпцый вучэбна-выхаваўчай работы, як сродак пераўтварэння педагагічнай працы ў прадуманую і навукова абгрунтаваную тэхналогію падрыхтоўкі і павышэння прафесійнага ўзроўню бібліятэчных работнікаў.

Інтэнсіфікацыя вучэбнага працэсу, удасканаленне вучэбна-метадычнага матэрыялу і дакументацыі дазволяць забяспечыць эфектыўную падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў у скарочаныя тэрміны навучання, арыентаваную на дасягненне перспектыўнага ўзроўню развіцця бібліятэчна-бібліяграфічнай навукі і практыкі. Падчас пошукаў аптымальных рашэнняў было б вельмі своечасова пры кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы на базе спецыялізацыі "дзіцячыя і школьныя бібліятэкі" (групы са скарочаным тэрмінам навучання) пачаць падрыхтоўку бібліятэкараў-сацыяльных педагогаў, маючых права працаваць дадаткова ў групах падоўжанага дня ў школах) і бібліятэкараў–настаўнікаў інфармацыйнай культуры. Гэта дазволіць узняць прэстыж прафесіі бібліятэкара.

**С.А.Паўлава**, *дацэнт*
**Н.А.Ляйко**, *прафесар*

## ТЭАРЭТЫЧНЫЯ І МЕТАДЫЧНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ВЫКЛАДАННЯ КУРСА "АБСЛУГОЎВАННЕ ЧЫТАЧОЎ"

Арыентацыя працэсу навучання ў вышэйшай школе на авалоданне фундаментальнымі ведамі (паняццямі, законамі, заканамернасцямі вучэбнай дысцыпліны), актыўнае выкарыстанне ведаў для творчага рашэння навуковых задач патрабуюць адпаведных пераўтварэнняў у змесце інфармацыі і кантролю вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў. Сёння перад вышэйшай прафесійнай школай паўстала пытанне аб падрыхтоўцы спецыялістаў новага пакалення, арыентаваных на будучыню. Гэта

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вельмі важна і для айчыннай бібліятэчна-інфармацыйнай адукацыі, якая забяспечвае падрыхтоўку высокакваліфікаваных кадраў, арыентаваных на авалоданне сучаснымі інфармацыйнымі тэхналогіямі і метадамі эфектыўнага абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк ва ўмовах абмежаванага рэсурснага забеспячэння.

Структураванне вучэбнага матэрыялу выступае адной з важнейшых умоў забеспячэння паспяховасці вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў, арганізацыі сістэмнага і мэтанакіраванага кантролю за ходам і вынікамі працэсу навучання. Структураванне – гэта вызначэнне істотных сувязей паміж рознымі элементамі зместу, вылучэнне асноўных паняццяў, размеркаванне матэрыялу ў завершаныя вучэбныя адзінкі, узгадненне лекцыйных, семінарскіх, практычных і лабараторных заняткаў, вызначэнне базавага і дапаможнага матэрыялу ў змесце курса.

Структураванне вучэбнага матэрыялу адбываецца на некалькіх узаемазвязаных этапах, якія дазваляюць раскрыць асаблівасці зместу вучэбнай дысцыпліны і працэсу яе вывучэння.

Папярэдні этап структуравання вучэбнай дысцыпліны пачынаецца са складання агульнай модульнай схемы яе вывучэння. На гэтым этапе аналізуецца змест вучэбнага курса з мэтай яго структурнага змянення, робіцца перакадзіраванне інфармацыі, вызначаюцца часавыя параметры вывучэння дысцыпліны; вучэбная дысцыпліна дзеліцца на завершаныя часткі (тэмы, раздзелы – змястоўна-інфармацыйныя вучэбныя элементы), вылучаюцца вучэбныя адзінкі, якія ўключаюць змест лекцыйных і лабараторна-практычных заняткаў; вызначаецца паслядоўнасць лекцыйных, семінарскіх і лабараторна-практычных заняткаў. Новая сістэма ацэнкі якасці ведаў студэнтаў уяўляе сабой сукупнасць кантрольных працэдур, аптымальна раскладзеных па ўсім часавым інтэрвале вывучэння дысцыпліны, звязаных з унутранай логікай пабудовы зместу дысцыпліны, яе месцам у вучэбным плане, графікам правядзення



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

самастойных і кантрольных работ. Таму неабходна вызначыць іерархію апорных і кантрольных кропак ацэнкі вынікаў вывучэння дысцыпліны.

Пад апорнымі кропкамі разумеюцца тыя заняткі (аўдыторныя і пазааўдыторныя), на якіх праводзіцца аператыўны кантроль ведаў, уменняў і навыкаў шляхам выкарыстання напрацаваных методык (тэстаў, экспрэс-кантрольных апытанняў тэарэтычнага матэрыялу, трэнінгаў і інш.). У якасці такіх кропак выступаюць заняткі, па якіх праводзяцца кантрольныя і самастойныя работы, абараняюцца індывідуальныя заданні, праводзяцца залікі і іспыты. Апорныя і кантрольныя кропкі раўнамерна размяркоўваюцца па траекторыі працэсу вывучэння дысцыпліны. Важна, каб кожны раздзел дысцыпліны меў неабходную колькасць апорных і кантрольных кропак ацэнкі вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў.

Вынікі ацэнкі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў у кантрольных кропках даюць магчымасць выкладчыку атрымаць інфармацыю аб якасці засваення студэнтамі вучэбнага матэрыялу, стымуляваць іх рытмічную работу на працягу семестраў, устанаўліваць узровень дасягнутых вынікаў, высвятляць недапрацоўкі ў фарміраванні уменняў і навыкаў, рэалізаваць ацэнку з выкарыстаннем балаў вынікаў вывучэння таго ці іншага модуля і вучэбнага курса наогул.

Названыя працэдуры дазваляюць вызначыць паслядоўнасць лекцый, лабараторна-практычных заняткаў, самастойных і кантрольных работ. У выніку атрымліваецца структурная схема, якая ахоплівае ўсю вучэбную работу студэнтаў па дысцыпліне.

Такім чынам, атрыманая структурна-змястоўная мадэль вывучэння дысцыпліны з'яўляецца арыенцірам у рабоце як выкладчыка, так і студэнтаў.

Сучасная канцэпцыя курса "Абслугоўванне чытачоў" распрацавана і паспяхова апрабіруецца прадметна-метадычнай камісіяй кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Курс узбагаціўся новымі раздзеламі, тэмамі, яго матэрыял адлюстроўвае шэраг дыскусійных пазіцый, мае большую дакладнасць і змястоўнасць, што пазітыўна ўспрынята студэнтамі, а таксама практыкамі. Матэрыял структурна адпавядае асноўным сацыяльным функцыям і прынцыпам бібліятэк, на базе якіх створаны тэматычныя комплексы. У адрозненне ад праграмы курса "Бібліятэчнае абслугоўванне", распрацаванай аўтарамі ў 1994 г., перагледжаны метадалагічныя асновы курса, улічаны ўмовы фарміравання айчыннага абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк, звернута ўвага на бібліятэчныя інавацыі, абумоўленыя інфармацыйнымі і сацыяльнымі тэхналогіямі. Вылучаны наступныя раздзелы: "Сутнасць абслугоўвання карыстальнікаў", "Бібліятэкар і карыстальнік бібліятэкі", "Сістэма, структура і тэхналогія абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк", "Формы і метады абслугоўвання". Структуравана 18 тэм, сярод іх тэмы, прысвечаныя сацыяльнай ролі і філасофіі абслугоўвання, кіраванню, а таксама структурным змяненням у абслугоўванні, асаблівасцям абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэкі з фізічнымі і псіхалагічнымі недахопамі, развіццю Public relations у бібліятэцы, рэкламе кнігі і бібліятэкі.

Па матэрыялу 10 тэарэтычных лекцый распрацаваны лабараторна-практычныя заняткі, на якіх замацоўваюцца атрыманыя веды.

На асноўным этапе структуравання вучэбнай дысцыпліны намі вылучана сукупнасць элементаў, якія дэталізуюць функцыянальную мадэль вывучэння курса. Перш за ўсё гэта змястоўна-інфармацыйныя элементы, што ствараюць змястоўна-інфармацыйны блок узаемазвязаных вучэбных элементаў дысцыпліны і падаюцца ў графічным адлюстраванні. Засваенне змястоўных элементаў немагчыма без ведання іх мэтавага прызначэння і матываў вывучэння. Сукупнасць усіх матывацыйна-мэтавых вучэбных элементаў стварае ўзаемазвязаны матывацыйна-мэтавы блок вучэбных элементаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кожны змястоўна-інфармацыйны элемент уключае пэўныя асноўныя паняцці вучэбнай дысцыпліны. На падставе гэтага студэнты складаюць тэзаўрус, які дазваляе выявіць агульную паняційную сістэму прадмета.

На заключным этапе для кожнага змястоўнага элемента ўводзіцца дадатковы вучэбны элемент, які ўключае звесткі, што маюць дачыненне да зместу вучэбнага элемента. У вучэбны элемент уключаюцца матэрыялы, якія паказваюць інтэграцыйныя тэндэнцыі паглыблення дысцыпліны – даныя педагогікі, псіхалогіі, сацыялогіі, інфарматыкі і іншых сумежных дысцыплін. Напрыклад, пры засваенні тэмы "Вывучэнне чытача і чытання. Тыпалогія чытачоў" аналізуюцца псіхалагічныя аспекты функцыянавання сістэмы "кніга – бібліятэкар – чытач", разглядаюцца пытанні дыферэнцыяцыі чытачоў на чытацкія катэгорыі, групы, тыпы. Студэнты самастойна праводзяць тыпалагічны аналіз карыстальнікаў, а таксама аналіз асабістага ўспрымання тэксту на падставе тыпалогіі, распрацаванай спецыялістамі, або прапануюць і абгрунтоўваюць сваю тыпалогію. Прычым аналіз праводзіцца і з пазіцый карыстальніка, і з пазіцый бібліятэкара. У пашыраны вучэбны элемент уключаюцца дзелавыя і ролевыя гульні. Выкарыстанне такіх гульняў асабліва важна пры вывучэнні пытанняў псіхалогіі бібліятэкара і псіхалогіі стасункаў бібліятэкара з карыстальнікам.

Матэрыялы, змешчаныя ў гэтым элеменце, садзейнічаюць развіццю ў студэнтаў цікавасці да вучэбна-пазнавальнай дзейнасці і яе матывацыі.

Сукупнасць усіх вучэбных элементаў ствараюць блок пашыраных вучэбных элементаў часткі або ўсяго курса. Распрацаваны вучэбныя элементы, якія ўключаюць рознаўзроўневыя заданні для кожнага змястоўнага вучэбнага элемента, а таксама заданні для развіцця агульнавучэбных уменняў і навыкаў, мысліцельных аперацый. Рознаўзроўневыя заданні пададзены на падставе тэорыі ўзроўневага засваення чалавекам ведаў, уменняў і навыкаў, распрацаванай дыдактыкай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Першы ўзровень вызначаецца як від дзейнасці, што забяспечвае студэнту магчымасць узнавіць інфармацыю аб аб'ектах вывучэння, выкарыстаць яе для аналізу канкрэтных тыповых сітуацый. Гэта ўзровень рэпрадуктыўнай дзейнасці.

Другі ўзровень – від дзейнасці студэнтаў, які характарызуецца ўменнем выкарыстоўваць атрыманую інфармацыю ў зменeнай сітуацыі, уменнем перакадзіраваць існуючую інфармацыю і перанесці яе ў новую сітуацыю, але блізкую да ўзору (нетыповая сітуацыя). Гэты ўзровень засваення вучэбнай інфармацыі эўрыстычны. Ён выкарыстоўваецца ў час гульні пад назвай "Бібліятэкар аддзела абслугоўвання" на трэцім этапе, калі студэнты актыўна ўдзельнічаюць і ў распрацоўцы, і ў правядзенні ролевых гульняў, творча падыходзяць да выканання заданняў, у падрыхтоўцы розных відаў выстаў.

Трэці ўзровень – творчая дзейнасць, якая дазваляе трансфармаваць зыходныя звесткі настолькі, што студэнты распрацоўваюць сцэнарыі, рыхтуюць і праводзяць комплексныя мерапрыемствы ва універсітэце і ў бібліятэках. Гэты ўзровень называецца творчым.

Для кожнага блока вучэбнага элемента намі распрацавана сістэма самастойнай работы студэнтаў з дакументальнымі і літаратурнымі крыніцамі, азнаямлення з практыкай абслугоўвання бібліятэк розных тыпаў і відаў.

Акрамя гэтага, у кожным вучэбным элеменце ёсць заданні па развіцці мысліцельных аперацый студэнтаў, уменняў і навыкаў планавання і арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці.

На заключным этапе структуравання вучэбнай дысцыпліны распрацоўваюцца кантрольна-ацэначныя вучэбныя элементы, у якія ўключаюцца ўсе віды кантрольных, самастойных работ, індывідуальных заданняў, апытанні па тэорыі, тэсты, анкеты. Сукупнасць усіх гэтых элементаў стварае блок кантролю вывучэння дысцыпліны, якую можна назваць знешняй блок-сістэмай. Аб'яднанне элементаў унутранай і знешняй блок-сістэм



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ствapae структурна-змястоўную (модульную праграму) мадэль вывучэння дысцыпліны.

Такім чынам, структураванне працэсу вывучэння дысцыпліны дазваляе вылучыць сістэму асноўных паняццяў, вядучых ведаў, завершаныя часткі, паказаць студэнту структуру працэсу вывучэння дысцыпліны, забяспечыць магчымасць выкарыстання па жаданні студэнтаў дадатковых матэрыялаў па кожнай тэме.

Н.Я.Петушко, *ст.выкладчык*

## ГУМАНІСТЫЧНАЯ НАКІРАВАНАСЦЬ ПАДРЫХТОЎКІ БУДУЧЫХ БІБЛІЯТЭКАРАЎ ДА РАБОТЫ З ЧЫТАЧАМІ З АСАБЛІВАСЦЯМІ ПСІХАФІЗІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Якасная падрыхтоўка спецыялістаў у вышэйшай школе – важная ўмова забеспячэння эканамічнага і сацыякультурнага прагрэсу, паскарэння сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных пераўтварэнняў у грамадстве. Кансерватызм у метадах арганізацыі вучэбнага працэсу, недахоп сродкаў на абнаўленне навуковай і інфармацыйнай базы, слабае матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне выклікалі неабходнасць распрацоўкі новых падыходаў да сістэмы вышэйшай адукацыі, канкрэтызацыі яе мэт, задач, прынцыпаў і шляхоў удасканалення.

Па гэтай прычыне ў пачатку 90-х гадоў XX ст. у рэспубліцы пачалася рэформа вышэйшай школы. У аснову навучання і выхавання асобы пакладзены прынцыпы дэмакратызацыі, гуманітарызацыі, гуманізацыі, бесперапыннасці адукацыі, павышэння якасці прафесійнай падрыхтоўкі.

Канцэпцыя адукацыі распрацавана ў дачыненні да вышэйшай школы [6]. Яна рэалізоўвалася ў 1999–2004 гадах і прадугледжвала комплекс эканамічных, фінансавых, кіраўніцкіх, арганізацыйных, кадравых рашэнняў. Асабліва падкрэслена роля